10 июня, четверг
1999 г.
N23 (68)

Приложение - программа ТВ

Цена - 25000 руб.

Биржа информации

до окончания полномочий президента согласно Конституции 1994 г

осталось 41 день

Власти хотят скрыть правду ...

7 июня совет правозащитного центра "Весна-96" принял специальное заявление, в котором утверждается, что власти хотят скрыть от народа правду о трагедии в подземном переходе станции метро "Немига" в Минске. Так, по заявлению представителей "Весны-96", власти противодействовали проведению независимого расследования этой правозащитной организацией. После того, как 4 июня была распространена первая информация о расследовании, в "Весне-96" был отключен телефон. Как выяснилось позднее, кто-то обрезал телефонный кабель. На следующий день старший помощник генерального прокурора Беларуси Алексей Таранов со страниц газеты "Советская Белоруссия" предупредил, что попытки проводить собственное расследование противоречат законодательству и влекут за собой уголовную ответственность.

"И заявление с угрозами из прокуратуры, и последовавшие за этим репрессивные действия, - говорится в заявлении правозащитного центра, - свидетельствуют о том, что власти стремятся скрыть от граждан правду о причинах трагедии и запугать тех, кто попробует опровергнуть версию президента, уверенно высказанную им сразу после трагедии, об отсутствии виновных".

Авторы заявления напоминают, что коммунистические власти на протяжении десятилетий скрывали правду о массовых убийствах людей в Куропатах, в районе нынешнего парка имени Челюскинцев, Лошицы. И только общественные расследования позволили раскрыть правду о сталинском геноциде. Совет правозащитной организации "Весна-96" заявляет, что действия по расследованию событий 30 мая основываются на законе и Конституции Республики Беларусь, в которой говорится о праве граждан получать и распространять правдивую информацию.

Владимир ГЛОД, БелаПАН.

НАЗАД В РАБСТВО

100 ТЕЛЕФОННЫХ ЗВОНКОВ ГРОДНЕНЦАМ



Помните анекдот о том, как внучка декабриста, обрадовавшись свержению самодержавия, спросила большевика в 1917 году: "Для чего вы делаете революцию?" Революционер ответил: "Чтобы не было богатых!" "Странно, - задумалась барышня. - А дедушка хотел, чтобы не было бедных". Дедушка-декабрист был человек образованный и прогрессивный, к тому же - гуманист, то есть, любил людей и считал несправедливым, что многие из них живут в жуткой нищете. Большевик-революционер тоже считал себя гуманистом, однако, будучи человеком бедным, слабо образованным и плохо воспитанным, получив власть, решил, что для победы над бедностью достаточно забрать у богатых богатство. Большевик, примитивным и испытанным на лесных дорогах способом (других - не знал), ограбил тех, у кого хоть что-нибудь было, и заявил, что отныне он берет на себя заботу по обеспечению граждан всем (по мнению большевика) необходимым. Под лозунгами перехода от капитализма к социализму, большевик фактически вернул в страну рабовладельческий строй, против которого выступал декабрист.

Подданые большевистского государства были лишены возможности самим строить собственное благополучие, которое, как известно, основывается на частной собственности. Им, как и положено рабам, предлагалось работать на государство-рабовладельца и благодарить его за то, что оно изволит делиться с ними, ими же созданными благами. Любые попытки стать богаче за счет собственной хозяйственной инициативы, подавлялись. Неудивительно, ведь в противном случае необходимость в содержании огромной армии дармоедов-распределителей произведенных рабами благ - отпадала. В конце 80-х наступило прозрение и, согласно законам эволюционного развития общества, на постсоветском пространстве после рабовладельческого строя начался капитализм, со всеми его достоинствами и недостатками.

Недостатки компенсировались главным достоинством, которое несла новая общественно-политическая формация - СВОБОДОЙ. Но, среди обретших эту самую свободу народов, нашелся народ рабов, то есть - мы, дорогие сограждане. Мы испугались свободы, испугались того, что нам самим придется заботиться о собственном благополучии и благосостоянии, прилагая для достижения успеха максимум сил и таланта, и захотели обратно в рабство, где о рабской (одинаковой для всех) похлебке позаботится хозяин. Для этого мы выбрали себе хозяина и позволили ему решать за нас, сколько мы должны зарабатывать, с кем мы должны дружить, на каком языке говорить, хозяин стал устанавливать цены на так необходимую нам "чарку и шкварку". Тем же из нас, кто хотел бы кушать вкуснее и калорийнее, хозяин предложил эмигрировать или сесть в тюрьму.

Недавно придворный парламент хозяина от слов перешел к делу и внес в уголовный кодекс статью 256, которая предусматривает наказание за спекуляцию. То есть - за перепродажу товаров с целью наживы, а иными словами - за предпринимательство. Вскоре данную поправку может утвердить президент. С мнением рабов, как водится, власть не ознакомилась.

Зато "БИ" спросила самых свободных людей в Беларуси - гродненцев:

СЛЕДУЕТ ЛИ ПРИВЛЕКАТЬ К УГОЛОВНОЙ ОТВЕТСТВЕННОСТИ ЗА СПЕКУЛЯЦИЮ?

Нет - 54 %

К удовольствию "БИ", свободных людей среди гродненцев оказалось большинство. "Нигде такого понятия нет, и нам этого не надо. Разве можно наказывать за то, что в других странах поощряется" - заявил представитель данной группы опрошенных. Недоумевал по поводу нововведения и другой наш респондент: "Если кто-то купил товар в магазине и отвез его, чтобы продать, например, в деревню, где такого магазина нет, то человек оказал сельскому жителю услугу. За услугу - надо платить. За что же тут наказывать?". Впрочем, не все наши телефонные собеседники, услышав слово "спекуляция", понимали, что речь идет о перепродаже товара. Но, уразумев, что спекуляция не является ни воровством, ни уклонением от уплаты налога они говорили: "Если человек платит налоги, то пускай перепродает как ему заблагорассудится и по какой угодно цене. Если он поставит цену завышенную, то у него и так никто его товар не купит. Значит, такой коммерсант накажет сам себя". Даже среди людей пожилого возраста нашлось немало противников преследования за спекуляцию: "Сейчас такое время, что трудно выжить. Для многих это единственный способ" - заметила пенсионерка, которая не желает голодать, ожидая от президента очередной подачки к трехмиллионной пенсии. По признаку принадлежности к торговцам, в пользу спекуляции высказывались и совсем молодые люди: "Потому что сам этим занимаюсь и сидеть не хочу".

Да - 38 %

Среди непримиримых врагов спекуляции большинство - пенсионеры: "Года три можно дать, потому что они слишком много хотят заработать помимо зарплаты". Или: "Спекуляция мешает нормальным людям жить. Спекулянты гнут такие цены, что у них нам - пенсионерам, ничего невозможно купить". Подобных объяснений вреда спекуляции было очень много. Вероятно, пенсионеры считают, что пенсии, которые платит им президент - очень большие, и не это причина их нищенского существования. Некоторые пытались мыслить государственными масштабами и почему-то заявляли, что спекуляция "не отвечает государственным интересам". Если воспринимать государство как структуру, призванную распределять все и вся (можно даже без денег), то эта группа опрошенных - права. К сожалению, среди противников спекуляции оказались и совсем молодые люди. Так, четырнадцатилетняя школьница согласна с тем, чтобы посадить человека в тюрьму, потому что "купив что-то в магазине - нельзя на этом зарабатывать". И все-таки главным грехом спекулянтов, по мнению большинства представителей данной группы, является то, что они торгуют тем, чего не производят. На вопрос - можно ли эффективно совмещать производство с торговлей - никто не ответил.

Наказывать, но не в уголовном порядке - 8 %

Восемь гродненцев настояли на компромиссном решении: "К уголовной - не надо. Может штрафа будет достаточно?" - сказал один из респондентов. А, судя по голосу, молодая женщина спасла бы спекулянта от тюрьмы только для того, "чтобы не калечить ему и его детям будущее". Доводы же за то, что спекуляция - явление вредное, были идентичны тем, что представлены выше.

Итак, отношение к спекуляции среди гродненцев - неоднозначное. Мнения о ее вреде разделились примерно пополам. Из этого следует, что в случае жесткого преследования спекулянтов раскол в белорусском обществе будет прогрессировать. Те, кто почувствовал себя собственником, будет до конца стоять за свое имущество (статья предусматривает конфискацию), а люди с рабским сознанием будут всячески помогать соответствующим органам наказать "богатого" соседа-торгаша. Чего добьются враги спекуляции, если победят в этой борьбе? Правильно, системы тотального государственного распределения товаров и, как следствие, дефицита, очередей, нелегальной (без налогов) торговли и (а куда же без нее) - коррупции. Нравится? "БИ" - нет.

А. ПЫТАЛЬНИК

Дзятлава развіталася з Андрэем

Да сённяшняга дня ўся Беларусь знаходзіцца ў шоку ад здарэння, якое адбылося ў падземным пераходзе станцыі метро "Няміга" у Мінску. Ахвярай гэтай бяды стаў і Андрэй Бурэц з Дзятлава. Прыгожы русавалосы хлопец, разумны і спагадлівы. Сёлета ён бы закончыў другі курс Беларускай аграрнай акадэміі. У падземным пераходзе на Нямізе ён апынуўся выпадкова, і выпадкова сустрэў там сваю смерць.

Дзятлава маланкай абляцела страшная навіна - у Бурцоў загінуў малодшы сын. Гэту добрую і працавітую сям'ю у гарадку ведаюць амаль што ўсе. Калі Андрэя прывезлі з Мінска, каб родная хата развіталася з ім, да сядзібы Бурцоў ішлі і ішлі людзі. Кіраўнікі раёна, прадстаўнікі працоўных калектываў, аднакурснікі, сябры і проста гараджане. Такім чынам яны імкнуліся падтрымаць родных і блізкіх нябожчыка. У Дзятлаўскім касцёле, куды занеслі труну с целам Андрэя, адбылася імша, потым - на могілках - жалобны мітынг.

На другі дзень пасля пахавання Андрэя Бурца, у Дзятлава завітаў дырэктар слонімскага малога прадпрыемства "Нёман" Канстанцін Кулакоўскі. Ад імя сваёй фірмы ён выказаў бацькам Андрэя Аляксандру Уладзіміравічу і Ядзвізе Іосіфаўне глыбокія спачуванні і перадаў ім ад МП "Нёман" 10 мільёнаў рублёў. Кулакоўскі паабяцаў гэтым людзям дапамагчы зрабіць помнік на магілу іх сына.

Забрала вада

На мінулым тыдні жыхары вёскі Разанаўшчыны дасталі з рэчкі Шчара труп свайго аднавяскоўца, 40-гадовага Васіля Мініна, які знік 14 лютага 1999 года.

З Э Л Ь В А

За рулём больш п'юць трактарысты

На Зэльвеншчыне ў траўні за кіраванне транспартам у нецвярозым стане міліцыя затрымала 21 чалавека.

Сярод іх 12 трактарыстаў з калгасаў "Зара", "Шлях Леніна", імя Леніна, "Новая жыццё", "Караліно", "Прагрэс" і імя Мічурына. У нецвярозым стане папаліся і два шафёры з калгаса "Рассвет".

М А С Т Ы

Нарэшце знайшлі дырэктара

Пасля таго, як былы дырэктар саўгаса "Мастоўскі" Г.Каробка быў абраны старшынёй Мастоўскага райсавета, узнікла праблема: знайсці чалавека на яго месца.

На працягу болей як месяца кіраўніцтва раёна шукала спецыяліста, бо многія кандыдаты, даведаўшыся пра рэальны стан спраў у гаспадарцы, адмаўляліся. Па меркаваннях некаторых спецыялістаў саўгаса, запазычанасці яго складаюць каля 40 млрд. руб. Урэшце рэшт заняць пасаду дырэктара саўгаса пагадзіўся аграном калгаса імя Карбышава Аляксандр Карук.

Не дапамаглі і краты

За некалькі апошніх месяцаў на Мастоўшчыне было абрабавана болей дзесяці магазінаў.

Найбольш не пашанцавала краме ў вёсцы Пладовая. Злодзеі яе наведвалі двойчы. Першы раз, дастаўшы шыбу і пагнуўшы краты, яны вынеслі некалькі пляшак гарэлкі. Другім разам падобным чынам яны скралі тавараў каштам амаль на 30 мільёнаў рублёў.

Сарай спаліў унучак

У Мастах на вуліцы Першамайскай 3-гадовы ўнучак, гуляючы з запалкамі, падпаліў хлеў свайго дзядулі.Згарэлі страха і перакрыцці будынка.

Г.С.

Акуляры "паедуць" у Індыю

Чатыры індыйскія фірмы заключылі кантракты з лідскім прадпрыемствам "Оптыка" на пастаўку акуляраў. Першая партыя прадукцыі накіруецца ў Індыю ўжо ў бліжэйшы час. Акрамя ўсяго лідчане працягваюць выконваць заказы для Польшчы, Германіі, Францыі, краінаў Балтыі і Расіі.

Нядаўна на заводзе змантавана новае абсталяванне, пасля чаго прадпрыемства пачне выпускаць сонечныя акуляры, а таксама акуляры з фотахромнымі лінзамі, якія вельмі карыстаюцца попытам.

Т.Ч.

Н А В А Г Р У Д А К

Першая сталіца прымае турыстаў

Мінулы тыдзень прайшоў у краіне пад знакам турызма. Асабліва шмат гасцей гэтымі днямі наведала першую сталіцу Вялікага Княства Літоўскага - горад Навагрудак. Выдатны гісторыка-краязнаўчы музей, музей нашага славутага Адама Міцкевіча, сталічны навагрудскі дух і, вядома, добрыя знаўцы нашай гісторыі, як Тамара Вяршыцкая, рабілі незабыўнае ўражанне на турыстаў. Дзіўна толькі, што шмат хто з іх упершыню даведаўся аб слаўным мінулым нашай краіны. А людзі ж былі самага рознага ўзросту...

Я.ЛАПЦЕЎ

Г Р О Д Н А

За лепшыя веды роднай мовы

У час правядзення святочных мерапрыемстваў з нагоды заканчэння навучальнага года Гродзенская рада ТБМ і ТБШ адзначылі падарункамі вучняў гарадскіх школ, якія на выдатна скончылі пачатковыя класы на беларускай мове. А такіх выдатнікаў набралася аж 77 з 11 школ. Падчас урачыстасцяў паўсюдна панаваў святочны настрой. Прыемна было і тое, што шмат хто з дзетак звязвае сваю будучыню толькі з адукацыяй на роднай мове. Дарэчы, было б не дрэнна каб на такіх мерапрыемствах папрысутнічалі чыноўнікі ад адукацыі рукамі якіх штогод закрываюцца нешматлікія беларускамоўныя класы. Зрэшты..., ініцыятары закрыцця беларускіх класаў (заўважце ўжо не школаў) будуць увекавечаны ў нашай гісторыі падобна Мураўёву-вешальніку. Іх імёны занесены ў "шэрую кнігу Беларусі", якая ў Мінску рыхтуецца да друку.

Алесь Краеўскі

И В Ь Е

Тополиный пух. Жара. Июнь. Не играйте со спичками

С наступлением теплых дней в районе зафиксировано уже пять пожаров по вине детей. Благо, наши доблестные пожарники вовремя успели справиться с огнем. Жертв нет, но убытки ощутимы.

Любім сваю Беларусь

Днямі на Іўеўшчыне прайшоў семінар культработнікаў раёна. Гаварылі аб праблемах, перспектывах, як заўсёды, дзяліліся вопытам. Але самым бадай цікавым адкрыццём было тое, што ў гэтых цяжкі час практычна пры кожнай установе культуры ў раёне адкрываюцца і дзейнічаюць хоць і невялікія этнаграфічныя куточкі, дзе можна даведацца аб гісторыі і культуры роднага краю.

І праўда, дзіўна?

В.ГУЛІДАВА

Л І Д А

На свята да Чыгуначнікаў

Сёлета Лідскаму лакаматыўнаму дэпо спаўняецца 145 гадоў. З гэтае нагоды на мінулым тыдні горад наведалі госці з Мінску. Прыехаў сам Малафеяў з дэлегацыяй дэпутатаў. Рабочым дэпо давялося добра папрацаваць, каб сустрэць высокіх гасцей: як заўсёды мялі, мылі, фарбавалі, нават буклеты спецыяльныя выпусцілі. Госці ж пахадзілі, паглядзелі, пагаварылі і ад'ехалі.

Т.Ч.

«Газель» из Лиды

В ближайшее время лидский завод "Неман" планирует приступить к выпуску специальных автомобилей для работников министерств здравоохранения и внутренних дел страны. Предполагается, что на базе микроавтобусов "Газель" будут собираться патрульные машины и автомобили "скорой медицинской помощи".

Сейчас представители "Немана" ведут переговоры с Горьковским автомобильным заводом /Россия/ о передаче документации на сборку таких автомашин и о поставке специальных машинокомплектов. По мнению специалистов завода, отпускна цена спецавтомобилей во многом будет зависеть от комплектации их специальной техникой. В настоящее время парк аналогичных машин в Беларуси состоит, в основном, из автомобилей Ульяновского и Рижского автомобильных заводов, давно устаревших и требующих замены.

Александр ПОПОВИЧ, БелаПАН

Г Р О Д Н О

Не выгодно ...

Гродненское ПО "Азот" несет серьезные убытки из-за поставок азотных удобрений на внутренний рынок. Около 70 процентов выпускаемых минеральных удобрений объединение реализует сегодня аграрному комплексу Беларуси, и из-за ограничений роста цен, введенных государством, поставки на внутренний рынок являются убыточными. Если в предыдущие годы убытки от продаж на внутреннем рынке возмещались доходами от экспортных операций, то в нынешнем году - в результате снижения на мировом рынке цен на химическую продукцию - "Азот" не может компенсировать эти убытки подобным образом.

Александр ПОПОВИЧ

«Безопасный город»



АКЦИЯ

Звоните в четверг или пятницу с 16.00 до 18.00 по тел. 72-13-68

ИНДУРСКОЕ ШОССЕ НА СТРАЖЕ ГРАНИЦЫ

Сигнал, поступивший в редакцию от читателя Леонида Черника в рамках акции "Безопасный город" подтвердился. Напомним, что читатель рассказал нам о радиолокационной станции, которая находится в военной части, расположенной вдоль Индурского шоссе. Данная РЛС включается в разное время суток, в результате чего в телевизионном и радио приемниках читателя появляется зуммер, а также временно выходят из строя электронные бытовые приборы. Кроме данных неудобств, Леонида Черника волнует вопрос, как данный сигнал может отразиться на состоянии здоровья людей, проживающих в зоне действия сигнала РЛС.

В зенитной бригаде, которой принадлежит РЛС, нам удалось выяснить, что сигнал, излучаемый данной станцией, действительно может создавать помеху в теле- и радиоприемниках окрестных домов: "Потому что это станция метрового диапазона". Что же касается воздействия ее на здоровье, зенитчики утверждают, что она "менее опасна, чем станции дециметрового или сантиметрового диапазона".

В руководстве ПВО корпуса подтвердили данную информацию, заметив однако, что помехи, создаваемые станцией, не могут служить основанием для ее вывоза за пределы городской черты потому, что "необходимость в РЛС большая". "Никто не сможет ее оттуда убрать - сказал нашему корреспонденту источник в руководстве ПВО. - Эта станция несет боевое дежурство по охране воздушного пространства страны. В прошлом году мы уже делали отписки по этому поводу городским и областным властям".

Скептически относятся к вероятности воздействия на военных и в городской санитарно-эпидемиологической службе. Главный санитарный врач города Николай Кендыш с сожалением сообщил нам, что "военные части - это белые пятна на плане города, мы не имеем на них никакого влияния". Для того, чтобы знать, какую опасность для здоровья может представлять такая станция, медикам необходимо ознакомиться с ее техническими характеристиками, а подобную информацию военные им вряд ли предоставят, сославшись на военную тайну.

Таким образом, в мирное время граждане, проживающие на Индурском шоссе, обречены на постоянные неудобства, связанные с оборонной политикой собственного государства. И это - несмотря на то, что согласно теперешней военной доктрине, конкретного врага у нашей страны нет. На вопрос "БИ", нельзя ли перенести РЛС куда-нибудь за город, один из руководителей ПВО корпуса заявил, что в таком случае необходимо было бы перевести за город и военную часть, что недопустимо. Вероятно, военные считают, что рациональнее было бы, если бы город переместился куда-нибудь подальше от их станции?

"БИ" считает иначе, поэтому не оставит данную проблему без внимания. На прошлой неделе редакция направила запрос главному санитарному врачу Гродно с просьбой дать заключение о соответствии санитарным нормам (предусмотренным для населенных пунктов) факта нахождения в городской черте военной радиолокационной станции. О результатах читайте в рубрике "Безопасный город" в ближайших номерах.

ПАТ

200 тысяч фунтов стерлингов для белорусских болот

Англо-правительственный фонд "Дарвиновскавя инициатива для исчезающих видов" только что приступил к финансированию проекта, конечным продуктом которого станут менеджмент-планы для трех ключевых низинных болот Полесья (Дикое, Споровское и Званец). Примечательно, что часть болота Дикого, примыкающего к Беловежской пуще, находится на территории Гродненской области. На составление планов по управлению тремя болотами английская казна выделяет 200 тысяч фунтов стерлингов; срок реализации проекта - три года.

Ради чего англичане "зарывают" деньги в белорусские болота? Они обеспокоены судьбой маленькой пичужки вертлявой камышовки. Это глобально угрожаемый вид, редкая птаха на планете Земля. Западная Европа, по сути, поставила крест на своих низинных болотах, где и гнездится вертлявая камышовка. А вот в Беларуси сосредоточена половина мировой популяции данного вида, отсюда и ее ответственность перед человечеством и природой за сохранение вертлявой камышовки. Отсюда и внимание иностранцев к белорусским низинным болотам. О них с восторгом отзываются доктор Поль Хосе (Королевское общество охраны птиц, Великобритания), председатель Международного торфяного общества Ханс Йоостен (Голландия), профессор, лауреат альтернативной Нобелевской премии г-н Зуков (Германия).

На "вы" - с большим почтением и орнитологическим интересом относится к вертлявой комышовке и наш земляк Александр Винчевский. Это он является бессменным президентом Западно-белорусского товарищества охраны птиц (ЗБТОП), где гродненцы занимают ключевое положение. Ему доверили и пост исполнительного директора Республиканского товарищества "Охрана птиц Беларуси", молодой и набирающей вес общественной организации. Как преподаватель высшей школы он проходил стажировку в Западной Европе. Опираясь на иностранных коллег, Александр Винчевский содействовал финансированию тех или иных проектов. Майская беседа с ним пролила свет и на такой поворот в судьбе низинного болота Дикого.

Это болото географически оригинально тем, что его влага дает начало рекам, впадающим как в Балтийское, так и в Черное море (не прямо, а через другие реки). И это один из крупнейших массивов, сохранившихся в Европе; и здесь обитает все та же вертлявая камышовка. Большая часть Дикого имела статус республиканского заказника. Правда, это еще не гарантия его надежной охраны. И тогда возникла идея: добиться присоединения низинного болота к Национальному парку "Беловежская пуща". Администрация парка с пониманием отнеслась к этой идее, но ее следовало подкрепить и соответствующими финансовыми вливаниями. И тогда ЗБТОП нашло и недавно перечислило Пуще деньги, а само товарищество компенсирует свои затраты благодаря финансовой поддержке зарубежных партнеров.

Вадим ЖУРАВЛЕВ

В БЕЛАРУСИ СТАНОВИТСЯ БОЛЬШЕ ДЕНЕГ И БОЛЬШЕ БЕДНЫХ

Ярослав РОМАНЧУК, экономический аналитик

В конце марта Совет Министров постановлением N 426 "О мерах по реализации закона Республики Беларусь "О бюджете РБ на 1999 год" принял наконец к исполнению бюджет на 1999 г. по доходам в сумме 414,8 трлн. белорусских рублей и расходам в сумме 448,35 триллиона и оборотной кассовой наличностью на 1.01.2000 года в сумме 175,7 трлн. рублей. Тем самым определен предельный размер роста денежной массы до конца года при условии, что не будет секвестирования и пересмотра всех показателей бюджета, как это было в прошлом году, когда по некоторым позициям годовой бюджет был почти выполнен за 6 месяцев. Как показывают цифры исполнения бюджета за первый квартал 1999 г., уже к середине лета следует ожидать очередного указа президента о бюджете. Еще в начале года было ясно, что курс 230 тысяч бел. рублей за 1 USD и месячная инфляция в размере 5% (именно на эти показатели был ориентирован главный финансовый документ страны) являются абсолютно нереальными базовыми индикаторами.

Информационная карусель

Данное постановление не вносит ничего принципиально нового в основные параметры фискальной политики Беларуси. Оно еще раз закрепляет сложившуюся систему взаимоотношений внутри отдельных подразделений исполнительной власти. Речь идет прежде всего о Национальном банке, правительстве и администрации президента, очертания которой явно просматриваются за скупыми цифрами доходной и расходной части бюджета. Совет Министров сам себе велит заключить с Национальным банком соглашение ***"об открытии целевой кредитной линии для финансирования дефицита бюджета, о передаче в республиканский бюджет 50 процентов прибыли Нацбанка, о передаче в республиканский бюджет дохода, полученного от размещения в банках-нерезидентах кредитов МВФ и других иностранных кредитов, полученных правительством РБ под его гарантии"***. Удивительно, что под данным постановлением не стоит подпись председателя правления Нацбанка.

Главная проблема здесь не в том, что такой договор заключается, а на каких условиях. Никто не отменял правила о разных условиях хозяйствования всех экономических субъектов. По сути дела, цену денег у нас определяет Нацбанк (читай -- администрация). Поскольку данный орган де-факто находится в оперативном подчинении правительства, то начальнику ничего не стоит цыкнуть на подчиненного и получить триллионы рублей под спасибо. Вы видели в Беларуси коммерческий банк или предприятие, которое закрывало разницу между активами и пассивами за счет печатного станка, которое имело бы неограниченные рублевые ресурсы под 1/4 ставки рефинансирования, которая сама по себе в 5 раз ниже инфляции? Если вы на минуточку вспомните, что получающий на таких условиях деньги субъект -- государство - занимает доминирующее положение на рынке инвестиций, капитальных ресурсов, производства и торговли, то вам станет ясен размер огромных искажений, которые данная мера оказывает на информационный фон республики. А директорам предприятий, частным предпринимателям, тем же государственным плановикам приходится принимать текущие решения, планировать тактические меры выживания на рынке как бы с завязанными глазами. Представьте себя на быстро вращающейся карусели. Мир вокруг сливается в одно большое размытое разноцветное пятно.Скорость вращения, угол наклона, время устанавливается не ими, а органами госуправления. Складывается впечатление, что рычаги управления белорусской "каруселью" сломались, управляющим стало страшно. Рано или поздно, с большим или меньшим количеством потерь и жертв карусель остановится. Мир обретет свои реальные очертания, и тогда очевидным станет неадекватность поставленным целям принимаемых экономическими субъектами решений.

30 процентов "горячих" денег в составе денежной массы -- это очень много. Не пройдет и двух месяцев, как цены совершат очередной скачок. К концу 1999 года при сохранении нынешних тенденций можно ожидать повышения минимальной зарплаты до 2 млн. рублей, что будет не более 2,5 долларов. В постановлении декларируется, что "повышенные размеры отчислений не должны приводить к росту цен и тарифов на продукцию (работы, услуги) по соответствующим отраслям и предприятиям...".

ХРОНИКА ПИКИРУЮЩЕГО БОМБАРДИРОВЩИКА
(белорусского рубля)

Дата:	М0 в трлн. BLR	М2 в трлн. BLR	М0 в % к М2
На 01.01.1997	*6,2*	*20,6*	*30*
На 01.01.1998	*12,3*	*41,85*	*29,4*
На 01.12.1998	*17,4*	*66,9*	*26*
На 01.01.1999	*27,1*	*96,1*	*28,2*
На 01.04.1999	*32*	*114,4*	*28*

Трудно себе представить практическую реализацию данного положения. Минэкономики уже принял ***"Положение о порядке формирования и применения цен и тарифов"***, которое открывает новый этап борьбы с предприятиями, которые поднимают цены. Если правительству все же удастся увеличить число субъектов, которые подчинятся новым правилам, то, во-первых, это будет означать падение объемов производства (никто не захочет работать себе в убыток), во-вторых, увеличение теневого оборота, в-третьих, увеличение числа убыточных предприятий и нагрузки на местные и республиканский бюджеты. С чем боролись, на то и напоролись.


Конфискант - белорусский национальный бренд

Бросается в глаза расширение количества чисто конфискационных мер для пополнения бюджета реальными деньгами. Все средства, получаемые государственными органами, включая в инвалюте, должны поступать в доход республиканского бюджета. ***"Осуществляется бесспорное списание средств со счетов заемщиков иностранных кредитов в размере платежей, произведенных из бюджетных средств в соответствии с платежными гарантиями правительства РБ"***. В безоговорочном порядке будут списываться и средства ***"со счетов субъектов хозяйствования, имеющих задолженности по ссудам, если такие ссуды выделялись через министерства, другие республиканские органы государственного управления..."***. Если мы вспомним размер штрафов и пени за просрочку с платежами в бюджет, за элементарные ошибки в бухучете (1 процент в день, конфискация ста процентов выручки плюс столько же штраф), вспомним недавний Декрет президента N 18 от 15.04.99, который предусматривает штрафы в размере от 50 до 500 минималок с конфискацией товаров и соответствующих транспортных средств (даже чужих) за "вывоз товаров из РБ с нарушением предусмотренных актами законодательства запрещений, ограничений и норм", то вырисовывается четкая картина: государство предпринимает пожарные меры для наполнения бюджета чужими деньгами. Частная собственность как институт стабильности экономики, как гарант привлечения инвестиций в Беларуси де-факто не существует.

Принятие закона о порядке уплаты подоходного налога с граждан по пятиступенчатой прогрессивной шкале также таит большой потенциал для пополнения бюджета. Рост инфляции неизбежно обесценивает зарплаты. Повышенные оклады попадут в категорию дохода, с которого уплачиваются большие налоги. Этот фискальный трюк часто используют западные страны. Дошла очередь и до белорусского правительства. А еще говорят, что белорусы не применяют западный опыт. Еще как применяют, правда, не в том, как произвести дешевле и качественней, а как забрать и перераспределить в пользу бесхозяйственных и убыточных.

Долги-то отдавать надо

Не надо сбрасывать со счетов и проблему обслуживания государственного долга. По закону "О бюджете", расходы по обслуживанию государственного внутреннего и внешнего долга в 1999 году составят 34,7 трлн. рублей против 5,3 триллиона в 1998 г. Платежи по погашению и обслуживанию внешнего госдолга из бюджетных средств составят 191,9 млн. рублей. По смешному курсу 230.000 рублей за 1 доллар это составляет 6,4 процента доходов консолидированного и 10,6 процента республиканского бюджета. Если сюда добавить расходы по долгу внутреннему, то расходы государства по данным статьям составляют, по словам Н.Корбута, "колоссальные суммы" - 11,5 процента доходов консолидированного и 19 процентов республиканского бюджета. Таким образом, иллюзия благополучия финансовой системы Беларуси рассеивается. Получение стабилизационного кредита от МВФ в размере 100 млн. долларов было бы как раз кстати, но решение пока не принято, а Нацбанк не в состоянии выполнить даже самые предварительные требования данной организации. Если бы все долги были внутренние, если бы не надо было платить твердой валютой за поставки сырья, кормов и комплектующих, да выдавать командировочные на поездки чиновников, то все вопросы дефицита и долгов закрывались бы очень просто. А так "враждебное" экономическое окружение, не желающее играть по национальным белорусским правилам, заставляет правительство внимательнее изучать экономическую "матчасть". Оно предпринимает всяческие меры по ужесточению контроля за движением и возвратом в страну валютных средств. Оно ограничивает применение наличной национальной валюты, одновременно расширяя официальные "полномочия" доллара. Да, можно вносить коррективы в административно назначаемые цены на древесину, лен, химические волокна с учетом роста индекса потребительских цен, но выше мировых цен не прыгнешь, а экспорт за белорусские рубли давно забыт.



Компенсуй - не компенсуй...

Формально не забыта и еще одна важная, скорее политическая деталь фискальной политики. Совет Министров "принял к сведению рекомендации Палаты представителей об изыскании в ходе исполнения республиканского бюджета дополнительных средств на увеличение ассигнований, предусмотренных на компенсацию населению ущерба от обесценения денежных сбережений и облигаций целевого беспроцентного займа". Неужели кто-то надеется получить хоть какие-то деньги под такую формулировку? Тут прямые указы и приказы не выполняются, тем более рекомендации, но чего только не пообещаешь всуе!

Впрочем, арсенал мер, направленных на возмещение средств населения, широк: можно начать компенсировать сначала тем, кому за 80, потом придумать своеобразный инвестиционный курс в полкурса Нацбанка, потом, в качестве принудительной солидарности поколений, перевести все текущие вклады в валюте по курсу Нацбанка в рубли, а потом часть вырученных средств направить на выплату лидерам компенсационного движения. Честнее и порядочней было бы сказать народу правду: "Никто никогда всем вкладчикам в полном объеме потерянные деньги не компенсирует". Но такой шаг требует политического мужества и стремления реально улучшить дела в экономике, качеств, которые так редки на Олимпе власти.

Итак, бюджет выполняется высокими темпами. Минфин рапортует о фискальных победах. Ценам приказано стоять, а производству расти. Под ласкающий ухо правительства рокот печатного станка уверенно уменьшаются реальные зарплаты. Несовместимость экономического поведения человека и правительства становится все более очевидной.

Страчаная спадчына

«Сфінкс» беларускай гісторыі?

У снежні 1918 г. Чырвоная армія заняла Менск. Урад Беларускай Народнай рэспублікі быў вымушаны пакінуць сталіцу. Партыя Леніна толькі на словах адмовілася ад працягу імперскай палітыкі расійскіх самадзержцаў. Кіраўніцтва БНР перабралася ў Гародню, якая на непрацяглы час стала неафіцыйнай сталіцай рэспублікі. Разам з урадам прыехаў Раман Аляксандравіч Скірмунт. Гэты чалавек - адна з найбольш цікавых і таямнічых постацяў нашай гісторыі 20 ст. Сцяпан Некрашэвіч, вядомы дзеяч сярод беларускіх сацыялістаў, у адным са сваіх артыкулаў назваў яго "неразгаданым сфінксам".



Раман Аляксандравіч Скірмунт

Што ж гэта быў за чалавек, і як выглядаюць асноўныя вехі ягонай палітычнай біяграфіі?

У 1905 г. у Львове была надрукавана брашура, прысвечаная нацыянальнай і палітычнай пазіцыі шляхты Беларуска-літоўскага краю. Яе аўтар, які схаваўся пад псеўданімам "Ро... Мунт", сцвярджаў, што сярод мясцовай польскамоўнай шляхты ёсць вялізарная група людзей цалкам адданых сваёй Радзіме - Беларусі і Літве. Кніга была прасякнута замілаваннем да роднага краю і беларуска-літоўскім патрыятызмам. Яна прыцягнула да сябе ўвагу, і хутка ў Беларусі стала вядомым імя аўтара - Раман Скірмунт. Ідэі гэтага чалавека сталіся падмуркам ідэалогіі так званых "краёўцаў".

Краёўцы зыходзілі з таго, што Беларуска-літоўскі край - агульная Радзіма ўсіх карэнных народаў нашай зямлі. Да галоўных з іх яны адносілі беларусаў, літоўцаў, палякаў і яўрэяў. Краёўцы заклікалі да яднання ўсіх гэтых народаў на глебе інтарэсаў Радзімы. Яны, быццам, прадчувалі, што толькі адзінства дазволіць з годнасцю супрацьстаяць выпрабаванням стагоддзя, якое толькі што распачалося. Раман Скірмунт як і іншыя прыхільнікі краёвай ідэалогіі спрабавалі не дапусціць абвастрэння міжэтнічных адносін у краі. Апошняе было цалкам верагодна ва ўмовах нацыянальна-культурнага Адраджэння беларусаў і літоўцаў, развіцця польскага руху, актывізацыі яўрэйскіх грамадскіх арганізацый і з'яўлення ў краі шматлікіх расейскіх шавіністычных груповак і партый тыпу "Саюза рускага народу". Краёўцы адчувалі тыя перамены, што адбываліся ў Еўропе, (сённяшнія даследчыкі называюць іх працэсам фармавання сучасных еўрапейскіх нацый) і прапагандавалі ідэю прыналежнасці ўсіх карэнных народаў краю да адзінай нацыі - нацыі ліцвінаў. На іх думку, нацыянальнасць вызначалася не мовай, не культурнымі сімпатыямі, а прыналежнасцю да Беларуска-літоўскага краю, успрыняццем яго ў якасці сваёй Радзімы, а не нейкіх там "Крэсаў усходніх" ці "Северо-Западного края России".

Роля Рамана Скірмунта ў станаўленні краёвай ідэалогіі была даволі прыкметнай. Але ён не толькі прапагандаваў ідэі. У 1906-1907 гг. Р.Скірмунт паспрабаваў стварыць Краёвую партыю Літвы і Беларусі. У гэты час ён ужо меў значны вопыт палітычнай дзейнасці, бо з'яўляўся дэпутатам І Дзяржаўнай думы ад Менскай губ. Падчас гэтага дэпутацтва выдатна праявілася адна з прыкметных рысаў характару Р.Скірмунта. Гэты чалавек заўсёды меў уласнае меркаванне і ніколі не баяўся выклікаць незадавальненне большасці сваімі думкамі.

І Дума, абраная ва ўмовах уздыму рэвалюцыі, была даволі радыкальнай па настроях большасці дэпутатаў. Галоўнае месца ў яе дзейнасці займала абмеркаванне аграрнай праблемы, і дэпутаты быццам спаборнічалі ў прапановах больш радыкальнага яе вырашэння. У прыватнасці, адной з найбольш папулярных была ідэя адчужэння ўсіх памешчыцкіх зямель з іх наступнай перадачай у дзяржаўны фонд. А вось Раман Скірмунт не лічыў такі шлях аптымальным для Беларуска-літоўскага краю. Адчужэнне памешчыцкіх зямель ён разглядаў як замах на сам прынцып прыватнай уласнасці, які не без падставаў разглядаўся дэпутатам у якасці краевугольнага камення еўрапейскай цывілізацыі. Не падабалася Р.Скірмунту таксама ідэя перадачы зямлі ў дзяржаўную маёмасць. З думскай трыбуны ён заявіў, што гэтая перадача зробіць рэальным гаспадаром зямлі не селяніна, а дзяржаўнага чыноўніка. А ад гэтага праіграюць усе апроч апошняга. (Дэпутат ад Менскай губ. быццам прадчуваў лёс сельскай гаспадаркі СССР.)

Прамова выклікала моцнае абурэнне рэвалюцыйна настроеных дэпутатаў. У зале ўзняўся шум. Р.Скірмунту не давалі гаварыць. Але ён усё ж такі давёў сваё выступленне да канца. За дэпутатам замацаваўся імідж "рэакцыянера-кансерватара", "абаронцы буйнога памешчыцкага землеўладання", "ворага" беззямельных і малазямельных сялян. На самой справе, гэта было зусім не так. Раман Аляксандравіч быў прынцыповым прыхільнікам павялічэння сялянскага землеўладання, але ён разумеў, што няма простага сродку вырашэння складанай аграрнай праблемы. Дэпутат прапанаваў надзяліць паўнамоцтвамі правядзення аграрных ператварэнняў мясцовае выбарнае самакіраванне, бо толькі яно ў стане ўлічыць усе асаблівасці кожнага рэгіёну вялізарнай імперыі.

Краёвая ідэя пацярпела крах. Нацыянальна-культурныя імкненні беларусаў, літоўцаў, палякаў і яўрэяў, распальванне міжэтнічнай варожасці расейскімі ўладамі не спрыялі яе пашырэнню. Краёўцы на фоне тагачаснага нацыянальнага абуджэння ўспрымаюцца сёння або як "апошнія магікане" талерантнага сужыцця народаў былога Вялікага Княства Літоўскага або як ідэолагі пэўнага рамантызму, што значна апярэдзілі свой час.

Краёвасць паступова замянялася польскасцю (для большасці), літоўскасцю (для меншасці) і беларускасцю (для адзінак). Сімпатыі Рамана Скірмунта да беларусаў, да іх мовы і культуры паступова робяць з гэтага краёўца дзеяча беларускага руху.

Зрэшты, ягоная прыхільнасць да беларускага нацыянальна-культурнага Адраджэння адчувалася здаўна. Па некаторых звестках ён аказваў дапамогу беларускаму друку (фінансава падтрымліваў "Нашу Ніву"), працаваў над слоўнікам беларускай мовы, нават напісаў некалькі лірычных вершаў па-беларуску. Напрыканцы 1916 г. па запрашэнню Максіма Багдановіча ён увайшоў у Менскі аддзел Беларускага Таварыства дапамогі пацярпелым ад вайны і досыць хутка ўзначаліў яго. Гэтая арганізацыя займалася не толькі дабрачыннай дзейнасцю. Фактычна, гэта быў сапраўдны цэнтр беларускага Адраджэння на ўсход ад лініі фронту.

12 сакавіка 1917 г. Аддзел наладзіў у Менску сапраўднае беларускае свята - Дзень беларускага значка. Паўсюль прадаваліся значкі з нацыянальнымі колерамі Беларусі - белым і чырвоным. На вуліцах, у кавярнях і крамах гучала беларуская мова. У адным з кінатэатраў адбыўся шматлюдны беларускі мітынг. Старшынёю быў Раман Аляксандравіч, які сам выступіў з вялікай прамовай на беларускай мове. Прысутныя прынялі рэзалюцыю, якая патрабавала аўтаноміі для Беларусі ў межах дэмакратычнай Расейскай рэспублікі.

У гэтым жа месяцы Р.Скірмунт быў абраны кіраўніком Беларускага Нацыянальнага Камітэту (БНК). На чале беларускай дэлегацыі ён паехаў у Петраград, каб пераканаць Часовы Урад у сур'ёзнасці беларускіх патрабаванняў. На жаль, урад новай Расіі не збіраўся прызнаваць правы беларусаў на самастойнае жыццё.

Трэба было шукаць іншых саюзнікаў і аб'ядноўваць усе беларускія сілы. Раман Скірмунт выдатна разумеў, што моц беларускага руху ў ягонай згуртаванасці. Ён шукаў шляхі кансалідацыі ўсіх беларускіх сіл. Кіраўнік Белнацкома паспрабаваў прыцягнуць да працы на карысць Беларусі ўплывовую і заможную беларускую арыстакратыю. На адно з паседжанняў Камітэту ён запрасіў Марыю Магдалену Радзівіл, Эдварда Вайніловіча, Гераніма Радзівіла і іншых прадстаўнікоў арыстакратыі, якія яшчэ раней праяўлялі свае сімпатыі да беларускага Адраджэння. Р.Скірмунт пераканаў гэтых людзей у неабходнасці дзеля будычыні Беларусі супрацоўнічаць з сацыялістамі. Яны згадзіліся ўвайсці ў склад БНК. На жаль, сацыялісты адмовілі гэтаму супрацоўніцтву. Яны, зрэшты, і на Скірмунта заўсёды глядзелі з падазрэннем.

У жніўні 1917 г. Раман Скірмунт, як былы дэпутат І Думы, атрымаў запрашэнне на т.зв "Маскоўскую нараду". Мэтаю нарады было абмеркаванне магчымасці ўстанаўлення ў Расіі "моцнай улады". Фактычна, размова ішла пра падтрымку планаў устанаўлення ваеннай дыктатуры генерала Карнілава. З'яўленне ў зале паседжанняў самога генерала прысутныя сустрэлі авацыяй. У аднадушным парыве яны ўзняліся з месцаў, каб выказаць свае захапленне асобай Карнілава. Застаўся сядзець і не пляскаў у далоні толькі адзін чалавек - Раман Скірмунт. Ён быў праціўнікам дыктатуры.

У 1918 г. Р.Скірмунт зноў адным з першых выступіў за незалежнасць Беларусі. У траўні-ліпені гэтага года ён узначаліў урад БНР. Дзеля незалежнасці Беларусі спрабаваў разыграць "нямецкую карту". Раней гэта зрабілі літоўцы, якія з дапамогай Германіі пачалі будаваць сваю дзяржаву. На жаль, у беларусаў нічога не атрымалася.

Змагаючыся за міжнароднае прызнанне Беларускай рэспублікі, Р.Скірмунт у Базеле ў канцы 1918 г. сустрэўся са стрыечным братам Канстанцінам Скірмунтам, фактычным міністрам замежных справаў Польшчы. Беларускі дзеяч спрабаваў выкарыстаць нават сваяцкія адносіны дзеля падтрымкі незалежнасці БНР Польскай дзяржавай. Але сваякі Рамана не разумелі ягоных беларускіх сімпатый. Не прынялі яны і эвалюцыі яго сацыяльных поглядаў у накірунку лібералізма. Той самы Канстанцін Скірмунт напоўжартам называў Рамана: "Наш бальшавік!"

Раман Скірмунт пратэставаў супраць Рыжскага міру, які падзяліў Беларусь паміж Савецкай Расіяй і Польшчай. Разам з Э.Вайніловічам выношваў планы не дапусціць зацвярджэння гэтага міру ў польскім сейме. Ён разумеў, чым можа абярнуцца для беларускай зямлі панаванне расейскіх бальшавікоў, бо бачыў, як пад чырвонымі сцягамі адраджаецца былая Імперыя, цалкам пазбаўленая нават налёту інтэлігентнасці і арыстакратызма.

Падзенне Беларусі пазбаўляла сэнсу ягоную палітычную дзейнасць. Ён вярнуўся ў свой маёнтак Парэчча, што недалёка ад Пінска. Чалавек вялізарнай актыўнасці, які з пачатку стагоддзя знаходзіўся ў цэнтры палітычнага жыцця Беларусі і Літвы, быццам знік з грамадска-палітычнай арэны. Ён засяродзіўся на гаспадарчых праблемах. Тым больш, што маёнтак знаходзіўся ў вельмі цяжкім становішчы. Нямецкія акупацыйныя войскі абрабавалі ўсе прамысловыя прадпрыемствы і вывезлі абсталяванне ў Германію. Першы год жыхары маёнтку амаль не бачылі мяса. Нягледзячы на гэта Парэчча стала прытулкам для блізкіх і сяброў Рамана Скірмунта, якіх вайна і рэвалюцыя пазбавіла даху над галавой.

Аднак не толькі гаспадарка займала былога кіраўніка Белнацкома. У 1926 г. у Варшаве выходзіць з друку яго кніга, прысвечаная творчасці Юліўша Славацкага. Літаратуразнаўцы могуць пацвердзіць высокі навуковы ўзровень працы.

Пасля майскага перавароту 1926 г. і вяртання да ўлады Юзафа Пілсудскага Р.Скірмунт паспрабаваў вярнуцца да палітычнай дзейнасці. Магчыма, з Ю.Пілсудскім былі звязаныя пэўныя надзеі пра адраджэнне Рэчы Паспалітай як сапраўднай федэрацыі свабодных народаў. У 1930 г. Раман Аляксандравіч абіраецца сенатарам ад Беспартыйнага блока супрацоўніцтва з урадам. Гэты блок між іншым выступаў за спыненне палітыкі асіміляцыі беларусаў і ўкраінцаў. Сенатар Скірмунт нават прымаў удзел у распрацоўцы новай канстытуцыі. Але даволі хутка ён зразумеў, што нацыянальная палітыка не памяняецца. Ён зноў (і на гэты раз канчаткова) адыходзіць ад актыўнай палітычнай дзейнасці і вяртаецца ў Парэчча.

Любімым месцам прагулак Рамана Скірмунта быў парк у Парэччы. Ён быў закладзены Раманам Аляксандравічам яшчэ на пачатку 20 ст. Дзеля гэтага спачатку давялося асушыць вялікі забалочаны бераг Ясельды. Парк плошчай каля 60 га шчыльна прымыкаў да ракі. Тут можна было ўбачыць побач з дубамі і клёнамі, акацыямі і вязамі розныя экзатычныя гатункі дрэваў, напрыклад, цюліпанавае дрэва, кедры, канадскія і сібірскія яліны. У парку жылі розныя жывёлы, вадзіліся роі балотных птушак, для якіх будаваліся спецыяльныя хаткі.

Сяляне паважалі Рамана Скірмунта, бо амаль заўсёды маглі разлічваць на ягоную дапамогу. Ён дапамагаў грашыма, даваў збожжа ў неўраджайны год, мог даць разумную раду. (Адна з версій, звязаных з абставінамі забойства Р.Скірмунта, сцвярджае, што мясцовыя сяляне доўгі час хавалі яго ад бальшавікоў у 1939 г.) Праўда, у адносінах да злодзеяў і ашуканцаў ён заўсёды праяўляў цвёрдасць і нават жорсткасць.

У жніўні 1998 г. разам з пінчуком Юрыем Друпам мы наведалі Парэчча. У старым парку адшукалі магілу. Надпіс на польскай мове паведаміў, што менавіта тут ляжыць Раман Скірмунт разам са шваграм Балеславам. Яны былі забітыя на пачатку кастрычніка 1939 г. Забівалі мясцовыя сяляне, якія мелі нейкую крыўду на "пана" і хацелі выслужыцца перад савецкай уладай. Улада патурала падобным забойствам. Рамана і Балеслава завялі ў лес, прымусілі капаць магілу. Раман Скірмунт адмовіўся гэта рабіць. Быццам бы, перад смерцю сказаў: "Я нічога дрэннага людзям не рабіў..."

Забілі чалавека, які павінен быў стаць першым беларускім прэзідэнтам. Думаю, што ён цалкам адпавядаў бы гэтай пасадзе, бо быў добра адукаваным і разумным, не быў абцяжараны нейкімі ідэалагічнымі догмамі, любіў Беларусь, ведаў і цаніў мову і культуру яе народу, у палітычнай дзейнасці шукаў не ворагаў, а сяброў і бачыў далей многіх іншых. Нам ніколі б не было сорамна за такога прэзідэнта.

Прах братоў Скірмунтаў пазней перанеслі з лесу ў парк. Магілу аднавіла адна з нашчадкаў роду пані Тэрэза Скірмунт з Варшавы.

Сумныя думкі прыходзілі ў галаву каля гэтай магілы: Можа беларуская зямля - гэта край пракляты Богам? Колькі ж таленавітых людзей нарадзіла яна! І якім страшным быў лёс большасці з іх! Звычайна - або самотнасць і адзінота, або перадчасовая смерць ці выгнанне на чужыну. Сапраўды - чужая Бацькаўшчына! Найлепшых часта забівалі тыя, пра шчасце якіх яны якраз і марылі.

Гэтыя думкі толькі ўзмацніліся, калі мы наведалі в. Маладова (у некалькіх кіламетрах ад Парэчча). Некалі гэта быў маёнтак Канстанціна Скірмунта. Стаяў прыгожы палац пачатку 19 ст. Знаходзіліся родавыя могілкі. Зараз яны нагадваюць сметнік з разбітымі надмагільнымі помнікамі і раскопанымі магіламі. Палац быў спалены ў 1939 г. Няўжо мы здольныя толькі знішчаць і разбураць?! Хочацца верыць, што гэта не так, што калі-небудзь Беларусь усё ж стане краінай прыгожых палацаў і ўтульных паркаў, краінай, у якой будуць шанаваць таленавітых і разумных. Дзеля такой Беларусі варта жыць і варта працаваць.

